## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*УДК 821.161.3.09*

*М. І. МУШЫНСКІ, М. А. ТЫЧЫНА, С. Л. ГАРАНІН*

# ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ (1931–2008 гг.)

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 03.12.2013)*

*Памяці першага дырэктара Інстытута літаратуры і мастацтва акадэміка І. І. Замоціна (1873–1942) прысвячаецца*

Асобныя праявы літаратурна-крытычных і тэарэтычных роздумаў пісьменнікаў і чытачоў адлюстроўваліся ў беларускай літаратуры амаль што адразу пасля яе ўзнікнення. Аднак фарміраванне літаратуразнаўства як асобнай навуковай дысцыпліны пачалося ў Беларусі толькі ў другой палове – канцы XIX ст., пазней чым у суседніх рускай, польскай і ўкраінскай культурах. Гэта тлумачыцца адсутнасцю сістэматычнага друку на беларускай мове, няспеласцю нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі, складаным становішчам самой беларускай літаратуры ў XVIII–XIX стст. і іншымі фактарамі. Пра беларускую літаратуру пачалі пісаць рускія і польскія крытыкі і гісторыкі, вялікае значэнне мела праца збіральнікаў фальклору, а таксама артыкулы і выданні А. Рыпінскага, А. Ельскага, Б. Эпімаха-Шыпілы і інш. Толькі ў самым канцы XIX і ў пачатку XX ст. у сувязі з нацыянальным Адраджэннем пачалі з'яўляцца даследаванні Я. Карскага, М. Багдановіча, пазней – В. Ластоўскага і М. Гарэцкага, што сведчыла аб станаўленні нацыянальнага літаратуразнаўства.

Кіраўніцтва Савецкай дзяржавы надавала літаратуры вялікае значэнне як фактару ідэалагічнай барацьбы, палітычнай агітацыі і народнай асветы. Бурнаму развіццю літаратуразнаўства спрыялі і палітыка беларусізацыі, што праводзілася ў 20-я гады XX ст., і агульны ўздым нацыянальнай культуры. У гэты перыяд вызначылася роля літаратуразнаўчай навукі ў кантэксце гуманітарнай культуры маладой рэспублікі: літаратуразнаўства брало на сябе не толькі ролю літаратурнай крытыкі і навукі аб паходжанні, сутнасці, законах развіцця мастацтва слова, але, закранаючы філасофскія, культуралагічныя, ідэалагічныя і сацыяльна-палітычныя праблемы, стала фактарам самаасэнсавання грамадства. Асабліва значнымі былі навукова-крытычныя, асветніцка-метадычныя, тэксталагічныя і тэарэтычныя працы вучоных Інбелкульта (1922–1928), калі намаганнямі Я. Барычэўскага, А. Вазнясенскага, М. Гарэцкага і іншых літаратараў былі закладзены метадалагічныя асновы далейшага вывучэння беларускай славеснасці. Рэарганізацыя Інбелкульта ў Беларускую Акадэмію навук прывяла да стварэнння ў яе складзе кафедры літаратуры. Да пачатку 1930-х гадоў яе навукова-даследчая база была ўжо настолькі значнай, а прэстыж літаратуры і літаратурнай навукі настолькі высокім, што 29 сакавіка 1931 года на базе згаданай кафедры быў заснаваны Інстытут літаратуры і мастацтва. Яго дырэктарам стаў адзін з пачынальнікаў беларусазнаўства, выдатны даследчык гісторыі рускай і айчыннай літаратуры акадэмік І. І. Замоцін. Артыкулы «Пуціны беларускай літаратуры», «Паэма Якуба Коласа «Сымон музыка» як аўтахарактарыстыка», «Чарговыя задачы вывучэння беларускай літаратуры» і інш. свед-

чылі аб працэсе выпрацоўкі цэласнай дыялектыка-матэрыялістычнай метадалогіі айчыннага літаратуразнаўства, пры якім вопыт рускіх гісторыкаў, тэарэтыкаў і літаратурных крытыкаў творча пераасэнсоўваўся і спалучаўся з дасягненнямі беларускай літаратурна-крытычнай думкі дарэвалюцыйнай пары. Вялікую ролю ў станаўленні Інстытута адыгралі таксама Янка Купала і Якуб Колас.

З ліпеня 1935 г. у сувязі са змяненнем структуры Акадэміі быў створаны аб'яднаны Інстытут мовы, літаратуры і мастацтва. Яго супрацоўнікамі-літаратуразнаўцамі былі пераасэнсаваны і выкарыстаны дасягненні культурна-гістарычнай школы, па-новаму ацэнены эстэтычная прырода мастацтва, вызначана роля суб'ектыўна-лірычных элементаў у паэзіі і ў літаратуры ў цэлым, вялася падрыхтоўка да напісання поўнамаштабнай «Гісторыі беларускай літаратуры».

У 1936–1937 гг. Інстытут узначальваў А. А. Александровіч, у 1937 г. абавязкі дырэктара выконваў Р. В. Краснеўскі, з 1937 г. дырэктарам стаў В. В. Барысенка.

Трагічна склаліся лёсы многіх супрацоўнікаў у другой палове 1930-х гадоў. Рэпрэсіі назаўжды вырвалі з шэрагу даследчыкаў І. І. Замоціна, Р. В. Краснеўскага, А. Я. Адзінца і многіх іншых вучоных. Беспадстаўна арыштаваныя, зняволеныя і асуджаныя, яны без звестак гінулі ў сталінскіх лагерах. Адзінкі, якія засталіся на працы, праз усё жыццё пранеслі страх перад праследаваннямі, чакаючы новай хвалі рэпрэсій нават тады, калі адгучалі салюты Перамогі, калі быў выкрыты культ асобы, калі пачалася «адліга» і краіна ўступіла ў новы этап сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця. Нягледзячы на цяжкі маральна-псіхалагічны стан, страту значнай часткі кадравага патэнцыялу (аб'яднаны Інстытут налічваў толькі 20 супрацоўнікаў, з якіх навуковыя ступені мелі 13), даследаванні літаратуры працягваліся ў перадваенныя гады. З друку пачалі выходзіць працы маладых навукоўцаў М. Р. Ларчанкі, Ю. С. Пшыркова, Н. С. Перкіна, С. К. Майхровіча, В. У. Івашына, прысвечаныя розным праблемам гісторыі літаратуры XIX–XX стст., жыццю і творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Янкі Лучыны, Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны многія з літаратараў уступілі ў рады Чырвонай Арміі, але ў 1943 г. Інстытут аднавіў сваю працу і пачаў называцца Інстытутам літаратуры, мовы і мастацтва. У ліпені 1944 г. установа вярнулася ў Мінск, мела ў сваім складзе тры сектары (мовы, літаратуры і мастацтва), у 1945 г. налічвала ўжо 26 супрацоўнікаў. Узначальваў Інстытут член-карэспандэнт М. Ц. Лынькоў. Асноўным напрамкам навуковай дзейнасці тагачасных літаратараў былі праблемы гісторыі беларускай літаратуры, укладу яе прадстаўнікоў у перамогу над фашызмам, грамадская значнасць і выхаваўчы патэнцыял літаратуры падчас вайны і аднаўлення народнай гаспадаркі. Навукоўцы рыхтавалі новыя падручнікі і хрэстаматыі, якіх тады не хапала ў школах (пераважная большасць якіх былі ў рэспубліцы беларускімі), з'явіліся і першыя манаграфічныя працы Ю. С. Пшыркова і С. К. Майхровіча. У 1952 г. з аб'яднанага Інстытута ў асобную структуру вылучылася мовазнаўства (адпаведна, Інстытут пачаў называцца Інстытутам літаратуры і мастацтва), былі створаны сектары савецкай і дарэвалюцыйнай літаратуры. Пашырылася тэматыка і паглыбіўся характар навуковых распрацовак, працягвалася спецыялізацыя навукоўцаў, прыйшлі свежыя сілы, якія былі накіраваны на даследаванне новых, яшчэ не засвоеных айчыннай навукай праблем гісторыі, тэорыі і тэксталогіі беларускай літаратуры, аднавіліся вывучэнне і выданне даўняй пісьмовай спадчыны беларускага народа. З 1952 г. Інстытут зноў узначаліў В. В. Барысенка, які заставаўся дырэктарам да 1973 г. Найбольш значныя навуковыя распрацоўкі гэтага часу – «Очерк белорусской советской литературы», «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» (1956, дапаможнік для студэнтаў ВНУ). Калі першая праца знаёміла ўсесаюзнага чытача з малавядомай на абшарах СССР беларускай славеснасцю, то другая дэманстравала пачатак пераадолення вульгарнага сацыялагізму і спрошчаных поглядаў на мастацкую форму літаратуры. У сярэдзіне 1954 г. на базе сектара беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры быў створаны сектар рукапісаў і выданняў, што спрыяла сталенню беларускай акадэмічнай тэксталогіі і выданню збораў твораў класікаў нацыянальнай літаратуры на Беларусі.

Пашырэнне кола навуковых даследаванняў, спецыялізацыя дысцыплін і рапрацоўка асобных навуковых метадалогій выклікалі ў 1957 г. неабходнасць новай рэарганізацыі, у выніку якой з'явіліся два асобныя інстытуты. У тым самым годзе Інстытуту літаратуры АН БССР было прысвоена імя Янкі Купалы. Вызначылася структура Інстытута, якая ў далейшым развівалася,

а таксама асноўныя напрамкі яго навуковай дзейнасці: гісторыя беларускай літаратуры, тэорыя літаратуры, літаратурная крытыка, тэксталогія і параўнальна-супастаўляльнае літаратуразнаўства. У гэты час ажыццяўляецца шэраг буйных даследаванняў і выдаюцца крытыка-бібліяграфічныя нарысы, адной з асноўных форм рэалізацыі навуковых вынікаў робіцца выданне індывідуальных манаграфій. Многія з кніг таго часу не страцілі сваёй навуковай значнасці і актуальнасці да сённяшняга часу. Сярод аўтараў, якія ўпісалі яскравыя радкі ў гісторыю філалагічнай навукі ў гэты перыяд, трэба назваць В. В. Барысенку, Н. С. Перкіна, В. У. Івашына, Ю. С. Пшыркова, А. М. Адамовіча, В. А. Каваленку, М. Р. Яроша, К. Р. Хромчанку, М. М. Барсток, М. М. Грынчыка. У адносна самастойныя напрамкі вылучыліся коласазнаўства (І. Я. Навуменка, Ю. С. Пшыркоў) і купалазнаўства (М. Р. Ярош і інш.), была распачата падрыхтоўка збораў твораў класікаў, рэалізацыя якой выпадае ўжо на наступныя гады: у 1956 г. пабачыў свет першы зборнік «Беларускія пісьменнікі другой палавіны XIX ст.», у 1957 г. былі выдадзены выбраныя творы М. Багдановіча, у наступны год – В. Дуніна-Марцінкевіча, у 1961–1964 гг. з’явіліся першыя зборы твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Менавіта ў другой палове 50 – пачатаку 80-х гадоў XX ст. акадэмічнае літаратуразнаўства развівалася найбольш паспяхова і плённа. Трэба, аднак, мець на ўвазе, што вучоныя працавалі ва ўмовах даволі пільнага палітычнага нагляду і ідэалагічнага ціску, якія з другой паловы 1960-х гадоў паслядоўна ўзмацняліся. У 1970-х гадах пачаўся пошук «дысідэнтаў» і «нацыяналістаў», па ідэйных прычынах былі звольнены М.І. Прашковіч і В. К. Зайцаў (пазбаўленыя працы і магчымасці працаваць, абодва вучоныя неўзабаве загінулі ў выніку трагічных выпадкаў), крытыцы з партыйна-ідэалагічных пазіцый падвяргаліся В. А. Каваленка і А. С. Яскевіч. Кіраўніцтва Інстытута, асабліва В. В. Барысенка, Ю. С. Пшыркоў, А. М. Адамовіч, Н. С. Перкін, А. Ф. Парэпка, прадпрымалі ўсе меры, каб абараніць сваіх супрацоўнікаў ад нападаў з боку партыйных наглядчыкаў і заўзятых ідэолагаў у самой Акадэміі (акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук К. П. Буслаў і інш.). Нягледзячы на гэта, у Інстытуце захоўвалася зычлівая атмасфера, гучала беларуская мова, распачаліся шырокія даследаванні спадчыны рэпрэсіраваных у 1930-я гады пісьменнікаў.

Разам з тым трэба мець на ўвазе, што амаль усе літаратары таго часу, асабліва прадстаўнікі старэйшага пакалення, якія сфарміраваліся як асобы і ўвайшлі ў навуку яшчэ да вайны або адразу пасля яе завяршэння (напрыклад, І. Я. Навуменка, А. Ф. Коршунаў і інш.), шмат у чым падзялялі афіцыйныя погляды на прыроду слоўнага мастацтва, на сацыяльны і класавы элемент у літаратуры, на суадносіны ідэйнага зместу і мастацкай формы і г. д. Але адзіная дыялектыка-матэрыялістычная метадалогія даследаванняў, адчуванне сябе ў кантэксце вялікай краіны, калі дасягненні суседніх братніх літаратур і навукі ўспрымаліся і выкарыстоўваліся нашымі вучонымі як свае, спрыялі кансалідацыі літаратуразнаўчых сіл рэспублікі, узбройвалі навукоўцаў дасканалым даследчa-паняційным апаратам, дапамагалі наладжваць сувязі з вядучымі навуковымі цэнтрамі краіны.

Дасягненні нацыянальнай гісторыка-літаратурнай і тэарэтычнай думкі гэтага перыяду прадстаўлены ў падрыхтаваных Інстытутам калектыўных працах «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (тт. 1–2, 1965–1966) і «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (тт. 1–2, 1968–1969). Гэтыя фундаментальныя даследаванні сталі этапнымі для ўсяго беларускага літаратуразнаўства, яны вызначылі шляхі яго далейшага станаўлення і развіцця. Абедзве работы характарызуюцца паўнатой фактычнага матэрыялу і навізной яго інтэрпрэтацыі. Выяўлены важнейшыя заканамернасці і тэндэнцыі літаратурнага працэсу на Беларусі. Шырока прадстаўлены літаратурны рух, ідэалагічныя спрэчкі, паказана дзейнасць пісьменніцкіх арганізацый, творчых аб’яднанняў, роля літаратурнай крытыкі і інш.

Выхад калектыўных «Гісторый...» актывізаваў навукова-тэарэтычную думку супрацоўнікаў Інстытута, пашырыў сферу іх даследчых інтарэсаў: беларуская літаратура пачынае разглядацца ў параўнальна-тыпалагічным плане (працы В. У. Івашына, А. І. Мальдзіса, Н. С. Перкіна, В. І. Гапавай, Э. М. Мартынавай, У. М. Казберука і інш.), уводзіцца паняцце еўрапейскага кантэксту (А. М. Адамовіч), паскоранасці развіцця беларускай літаратуры XIX–XX стст. (В. А. Каваленка). Паспяхова вывучаюцца тэарэтычныя і гістарычныя праблемы: станаўленне творчых

метадаў (В. У. Івашын, Н. С. Перкін), гісторыя беларускага вершаскладання (М. Р. Грынчык, І. Д. Ралько), праблемы творчай індывідуальнасці (У. В. Гніламёдаў), перакладу з блізкародных моў (А. С. Яскевіч), узаемадзеяння фальклору і літаратуры (І. П. Чыгрын), спецыфікі мастацкай формы, псіхалогіі творчасці, структуры твора (В. П. Жураўлёў, М. А. Тычына, А. П. Матрунёнак), гісторыі літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі (М. І. Мушынскі), новы імпульс атрымлівае вывучэнне старажытнай літаратуры (А. Ф. Коршунаў, В. А. Чамярыцкі, А. І. Мальдзіс).

Сапраўднай падзеяй у навуковым жыцці рэспублікі сталі манаграфіі А. М. Адамовіча «Маштабнасць прозы» (1972), «Здалёк і зблізку» (1976), Н. С. Перкіна «Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў літаратуры» (1971), «Человек в советском романе» (1973), М. І. Мушынскага «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 20–30-я гг.» (1975), І. Д. Ралько «Вершаскладанне» (1977), «Верш і мова» (1986), У. В. Гніламёдава «Традыцыі і наватарства» (1972), «Сучасная беларуская паэзія» (1983), В. П. Жураўлёва «Структура твора: рух сюжэтна-кампазіцыйных форм» (1978), А. П. Матрунёнка «Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане» (1972), «Псіхалагічная проза: традыцыі і час» (1988), А. С. Яскевіча «Грані майстэрства» (1974), «У свеце мастацкага твора» (1977), І. С. Шпакоўскага «Структура вершаванага вобраза» (1972), А. К. Кабаковіч «Беларускі свабодны верш» (1984), «Фальклорныя і анталагічныя традыцыі ў беларускай паэзіі» (1989), Л. Я. Гараніна «Праблемы мемуарнага жанру» (1981), «Философские искания в белорусской литературе» (1984) і інш.

Прыкметнымі вынікамі адзначана праца тэкстолагаў Інстытута: выданне больш поўных збораў твораў Янкі Купалы ў 7 тамах (1972–1976), Якуба Коласа ў 14 тамах (1972–1978); Кузьмы Чорнага ў 8 (1972–1975), І. Мележа ў 10 тамах (1974–1985) і інш.

Больш значнымі, параўнальна з папярэднімі, былі і буйныя фундаментальныя даследаванні абагульняючага тыпу: «История белорусской дооктябрьской литературы», «История белорусской советской литературы» (1977), аўтарскі калектыў якіх у 1980 годзе быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа. Абедзве кнігі напісаны на рускай мове і адрасаваны не толькі спецыялістам, але і шырокай чытацкай аўдыторыі, што мела вялікае пазнавальнае і культурна-выхаваўчае значэнне.

Інстытут папоўніўся здольнымі навукоўцамі: Л. М. Гарэлік, Т. С. Голуб, З. У. Драздовай, Л. А. Казырам, А. Л. Вераб'ём, В. В. Жыбулем, Т. М. Тарасавай і інш.

Усё большую ўвагу аддаюць даследчыкі праблемам мастацкай формы літаратурных твораў, вывучэнню паэтыкі, жанрава-стылістычнай спецыфікі літаратуры. Найбольш значнымі працамі ў гэтым напрамку з'яўляюцца манаграфіі У. В. Гніламёдава «Іван Мележ» (1984), «Янка Купала: Новы погляд» (1995), П. К. Дзюбайлы «У пошуках духоўных каштоўнасцей: Беларуская літаратура сёння» (1987), «Станоўчы герой у беларускай літаратуры: Савецкі перыяд» (1990), В. П. Жураўлёва «Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана» (1991), А. К. Кабаковіч «Максім Багдановіч: дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага» (1978), С. С. Лаўшука «Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я – пач. 30-х гадоў» (1984), Э. М. Мартынавай «Мастацкая дэталь у літаратурным творы» (1977), І. С. Шпакоўскага «Тыпізацыя ў лірыцы» (1980), «На драматургічных скрыжаваннях» (1989), Т. К. Чабан «Крылы рамантыкі» (1982), Т. К. Чабан і Я. А. Гарадніцкага «Сучасная паэзія і фрльклор» (1988), А. С. Яскевіча «Рытмічная арганізацыя мастацкага тэксту» (1991).

Пасля выхаду ў свет у 1959 г. першага навуковага збору твораў даўняй беларускай літаратуры – «Хрэстаматыі па старажытнай беларускай літаратуры», якую склаў кандыдат філалагічных навук А. Ф. Коршунаў, даследаванне літаратурнага працэсу на беларускіх землях у XI–XIX стст. узнялося на новы ўзровень. Сталі даступнымі забароненыя раней працы па гісторыі, грамадскай думцы, літаратуры, мастацтву Беларусі, у якіх закраналіся складаныя і дыскусійныя праблемы, даследчыкі-медыявісты атрымалі рэальную магчымасць працаваць з крыніцамі і больш аб'ектыўна вывучаць нацыянальную культурна-гістарычную спадчыну. Працы В. А. Чамярыцкага «Беларускія летапісы як помнікі літаратуры» (1969), А. І. Мальдзіса «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (1980), «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя» (1982), У. Г. Кароткага «Мялецій Смотрыцкі» (1987), У. І. Мархеля «Лірнік вясковы» (1983), шэраг крыніцазнаўчых даследаванняў Г. В. Кісялёва, заснаваных на багацейшым архіўным матэрыяле

(«Пачынальнікі» (1977), «Пуцявінамі Янкі Купалы» (1981), «З жыццяпісу Якуба Коласа» (1982), «Ад Чачота да Багушэвіча» (1993)), а таксама распрацоўкі М. І. Прашковіча і В. І. Дарашкевіча забяспечылі арганічнае ўключэнне помнікаў старажытнага пісьменства Беларусі ў кантэкст нацыянальнага літаратурнага развіцця.

Выдатным дасягненнем Інстытута ў 1980-я гады з'яўляецца распрацоўка і ажыццяўленне рэспубліканскай комплекснай Скарынаўскай праграмы да 500-годдзя з дня нараджэння вялікага беларускага асветніка-гуманіста і першадрукара. Была падрыхтавана і выдадзена цэлая серыя грунтоўных манаграфій, вельмі каштоўных зборнікаў, паглыблена даследаваны жыццё, дзейнасць і творчая спадчына Ф. Скарыны, усебакова раскрыты культурна-гістарычныя вытокі, змест, нацыянальнае і еўрапейскае значэнне яго патрыятычна-асветніцкага подзвігу.

З 1973 г. Інстытут узначаліў народны пісьменнік Беларусі, акадэмік І. Я. Навуменка. Працягваючы развівацца і ўдасканальвацца, навукова-даследчая структура ўстановы ўключыла ў сябе шэсць аддзелаў (выданняў і тэксталогіі, гісторыі старажытнай і новай беларускай літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя, сучаснай беларускай літаратуры і крытыкі, узаемасувязей літаратур, тэорыі літаратуры), укамплектаваных кваліфікаванымі навуковымі кадрамі. У 1976 г. быў створаны Савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, сваю працу працягвала аспірантура, а ў 1989 г. адкрылася дактарантура. За ўвесь час было падрыхтавана 27 дактароў і каля 150 кандыдатаў навук. Функцыянавала навуковая бібліятэка (з фондам 23 000 адз.), у якой захоўваліся архіўныя матэрыялы па творчасці Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Івана Мележа і іншых пісьменнікаў, выданні з дароўнымі надпісамі аўтараў.

Кадравы склад Інстытута працягваў паспяхова папаўняцца ў 1980–1990-я гады. У навуку прыйшлі здольныя маладыя даследчыкі П. В. Васючэнка, М. У. Мікуліч, А. Мельнікаў, І. В. Саверчанка, Г. М. Кісліцына, С. У. Калядка, Л. Г. Кісялёва, А. А. Манкевіч, І. М. Шаладонаў, А. У. Бразгуноў, Л. В. Ляўшун, Ж. С. Шаладонава, А. А. Яскевіч і інш. Найбольш спрыяльныя ўмовы для творчасці склаліся ў Інстытуце пад кіраўніцтвам акадэміка В. А. Каваленкі (дырэктар Інстытута з 1982 па 1997 г.) і акадэміка У. В. Гніламёдава (узначальваў Інстытут у 1997–2006 гг.). Талерантнасць і павага да меркавання іншых, высокі ўзровень патрабавальнасці, уласная абаяльнасць і прафесіяналізм зрабілі В. А. Каваленку і У. В. Гніламёдава прызнанымі лідарамі айчыннага літаратуразнаўства, забяспечылі Інстытуту высокі рэйтынг і павагу ў пісьменніцкім і выкладчыцкім асяроддзі.

Высокі навуковы ўзровень, вялікі колькасны склад, разнастайнасць даследчых методык пры адзінстве навуковай метадалогіі дазволілі калектыву Інстытута ў 1990-я гады рэалізаваць буйныя навуковыя праекты: «Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей» (кн. 1–4, 1993–1995), дзе на шырокім фактычным матэрыяле выразна раскрыты працэс узаемаўзбагачэння дзвюх славянскіх літаратур: беларускай і рускай – ад старажытнасці да нашага часу; біябібліяграфічны слоўнік «Беларускія пісьменнікі: у 6 тамах», складзены разам з Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф. Скарыны, у якім змешчана звыш 1200 артыкулаў персаналій беларускіх майстроў слова, літаратуразнаўцаў і крытыкаў; пабачылі свет Поўны збор твораў М. Багдановіча ў 3 тамах (1993–1995), першы Поўны збор твораў Янкі Купалы ў 9 тамах (10 кнігах) (1995–2003) і інш. Гэтыя выданні, а таксама новыя манаграфічныя даследаванні І. Я. Навуменкі, В. А. Каваленкі, М. І. Мушынскага, У. В. Гніламёдава, С. С. Лаўшука, В. П. Жураўлёва, М. А. Тычыны, У. І. Мархеля, Л. Я. Гараніна, А. С. Яскевіча, П. Васючэнкі, Л. М. Гарэлік, А. А. Мельнікава, С. Л. Гараніна, І. В. Саверчанкі, І. Э. Багдановіч, З. У. Драздовай, Г. М. Кісліцынай, Я. Я. Янушкевіча і іншых падпарадкаваны галоўнаму – стварэнню літаратурнай гісторыі Беларусі, прапагандзе нацыянальных мастацкіх дасягненняў. Заслужанае грамадскае прызнанне атрымалі аўтары шэрагу манаграфічных даследаванняў: Г. В. Кісялёў за кнігі «Разыскивается классик» і «Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча» ўзнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа (1990), група аўтараў (у іх ліку В. Дарашкевіч і В. Чамярыцкі) за цыкл работ «Скарына і беларуская культура» – Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь (1994), у 2000 г. А. А. Яскевіч была ўдастоена прэміі «За духоўнае адраджэнне».

Публікацыі новых матэрыялаў і дакументаў, што адкрыліся напрыканцы 1980-х і ў 1990-я гады, а таксама асобныя манаграфічныя працы пачатку XXI ст. былі скіраваны на паспяховае вырашэнне задач, што паўсталі перад беларускімі вучонымі і грамадствам у цэлым, – асэнсаваць шматвяковае развіццё нацыянальнага прыгожага пісьменства ва ўсім яго змястоўным, сэнсавым, жанрава-стылёвым багацці, у разнастайных сувязях з іншымі формамі духоўнай дзейнасці чалавека і з літаратурамі іншых народаў свету, раскрыць і паказаць той уклад, які ўнеслі беларускія майстры слова ў сусветную мастацкую скарбонку.

Напрыканцы XX – у пачатку XXI ст. з'явіліся перадумовы для кардынальнага пераасэнсавання гісторыі слоўнага мастацтва. Па-іншаму пачалі раскрывацца праблемы чалавека ў літаратуры і ў свеце, іншае сэнсавае напаўненне атрымала праблема рэлігійных пошукаў пісьменнікаў і літаратурных герояў, нечаканую актуальнасць набылі пытанні грамадскай і індывідуальнай маралі ў яе сацыяльна-гістарычным разрэзе, асаблівую вагу атрымала экалагічная праблематыка, якая, закрануўшы амаль усю гуманітарыстыку, абумовіла пашырэнне міждысцыплінарных даследаванняў. Пошук новых ведаў і новых светапоглядных сэнсаў не толькі выступаў фактарам генерыравання новыя ідэй, але і выводзіў акадэмічнае літаратуразнаўства на шлях пошуку новых жыццёвых стратэгій. Глыбокую распрацоўку атрымалі пытанні беларускай нацыянальнай ідэі (Л. Я. Гаранін, А. С. Яскевіч), гістарычнага выбару і адказнасці грамадства за сваё цяперашняе і будучыню (В. А. Каваленка, М. А. Тычына і інш.). На гэтым напрамку навука пачала шчыльней узаемадзейнічаць з публіцыстыкай, манаграфічныя даследаванні працінаюцца асобасным пачаткам, выкладанне матэрыялу робіцца больш даходлівым і эсэістычным.

Актывізацыя палітычнага жыцця ў канцы 1980-х гадоў, галоснасць, атрыманне Беларуссю незалежнасці, станаўленне нацыянальнай дзяржавы і з'яўленне ў літаратуры новых плыняў і стылёвых напрамкаў надзвычай абвастрылі спрэчныя пытанні беларусазнаўства, дазволілі па-новаму ацаніць беларускую літаратуру ў яе мінулым і сённяшнім, вярнулі з небыцця імёны многіх беларускіх пісьменнікаў і літаратараў. Цікавасць да мінулага айчыны, яе культуры ў цэлым і літаратуры ў прыватнасці ў грамадстве ўзрасла. У гэтых умовах асабліва рэзананснымі былі навуковыя, навукова-папулярныя і культурна-асветніцкія артыкулы М. А. Тычыны, В. П. Жураўлёва, С. А. Андраюка, У. І. Мархеля, Г. В. Кісялёва, Г. М. Кісліцынай, М. І. Мушынскага, Я. А. Гарадніцкага, Т. К. Грамадчанкі, А. А. Мельнікава, што на мяжы стагоддзяў задавальнялі і попыт на беларускае слова ў грамадстве, і прагу да перагляду звыклых догмаў савецкага часу. Адкрытым і прынцыповым стаў дыялог паміж літаратуразнаўцамі і пісьменнікамі, паміж літаратарамі і грамадскасцю, актывізаваліся сувязі акадэмічнай навукі з вышэйшай школай. Асабліва істотна пашырылася поле навуковых даследаванняў: больш аб'ектыўную ацэнку ў кантэксце нацыянальнай гісторыі атрымала беларуская літаратура на польскай, лацінскай, рускай мовах. Навукоўцы непасрэдна звярнуліся да спадчыны А. Міцкевіча, А. Ажэшкі і інш. У 1990 – пачатку 2000-х гадоў паглыбілася і коштам выкарыстання набыткаў заходнееўрапейскага літаратуразнаўства істотна абнавілася тэарэтычная база айчыннай філалагічнай навукі, што выводзіла працы Інстытута на ўзровень сусветнага разумення ўсяго спектра літаратуразнаўчай праблематыкі. Былі асэнсаваны шляхі і формы інтэграцыі беларускай літаратуры ў інфармацыйна-мастацкую прастору сусветнай культуры, вызначаны крыніцы і фактары яе шматграннага ўзаемадзеяння з еўрапейскім літаратурным працэсам. Гэта знайшло ўвасабленне ў канцэптуальна новай «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» ў 4 тамах (5 кнігах) (2003, выданне працягваецца), дзе працэс развіцця нацыянальнай прыгожай славеснасці краіны быў раскрыты ў цесным узаемадзеянні з развіццём іншых форм культуры.

Надзённыя патрэбы далейшага вывучэння і папулярызацыі багатай пісьмовай спадчыны беларускага народа прымусілі актывізаваць падрыхтоўку розных выданняў помнікаў даўняй і новай літаратуры. Сапраўднай падзеяй у культурным жыцці краіны стала выданне ў 2003 годзе «Анталогіі даўняй беларускай літаратуры». Грунтоўным падсумаваннем назапашанага папярэднікамі вопыту ў даследаванні нацыянальнай літаратурнай спадчыны, а таксама вынікам уласных навукова-творчых намаганняў супрацоўнікаў стала двухтомная «Гісторыя беларускай

літаратуры XI–XIX стст.» (2006, 3-е выд. 2010). Яна з'яўляецца сістэмным абагульненнем працы за ўвесь перыяд 1970–1990 гг., адзначыўшы завяршэнне другога этапу гісторыі беларускай літаратурнай медыявістыкі. Даследаванне грунтуецца на агромістым, па-новаму асэнсаваным з выкарыстаннем апошніх дасягненняў айчыннага і замежнага літаратуразнаўства фактычным матэрыяле. У выніку яго паглыбленага вывучэння выпрацавана і рэалізавана новая канцэпцыя гісторыі беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў, зроблена новая сур'ёзная спроба больш шырока і аб'ектыўна раскрыць панараму яе складанага шматвяковага развіцця, своеасаблівасць гістарычнага шляху ад зараджэння пісьменства на беларускіх землях у перыяд ранняга Сярэднявечча да часу фарміравання нацыянальнай літаратуры ў XIX ст., што дазваляе арганічна ўпісаць яе ў агульнаеўрапейскі кантэкст. Сярод найбольш значных навуковых распрацовак гэтага часу варта таксама вылучыць «Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей: Культурна-гістарычны і літаратурныя аспекты праблемы» (2002), калектыўныя манаграфіі «Сучаснае беларускае літаратуразнаўства: сістэма каштоўнасцей і прыярытэтаў» (2006), выдадзеныя сумесна з Інстытутам славяназнаўства кнігі «Белорусско-российский диалог: Культура и литература Беларуси XX–XXI вв.» (2006), «Літаратура пераходнага перыяду: Тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу» (2007), «Янка Купала і Якуб Колас і дзяржаўна-культурнае будаўніцтва» (2007). Новы імпульс атрымалі індывідуальныя даследаванні, вынікі якіх рэалізоўваліся ў грунтоўных навуковых манаграфіях М.І. Мушынскага «Тэксталогія твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа» (2007), С. У. Калядкі «Непрыручаная птушка Палесся: Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц» (2007), А. У. Бразгунова «Перакладная белетрыстыка Беларусі XV–XVII стст.» (2007), В. А. Максімовіча «Нацыянальны космас класікі: Дыялог традыцый і наватарства ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа» (2008) і іншых даследчыкаў.

Разам з тым з пачатку 2000-х гадоў пачалі выяўляцца і крызісныя з'явы, звязаныя з разбурэннем адзінай навуковай метадалогіі, недахопам маладых кадраў і зменай ролі і месца літаратуры ў духоўным жыцці грамадства, карэннай перабудовай яго вартасных арыенціраў. Адставанне заўважалася ў асэнсаванні значнасці новых інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, а таксама з'яўленні новых агрэсіўных адгалінаванняў «масавага мастацтва», якія адсоўвалі літаратуру на перыферыю духоўнага жыцця. Асабліва вострымі гэтыя супярэчнасці сталі ў другой палове 2000-х гадоў, калі ў асяроддзі інтэлігенцыі пачаў выяўляцца своеасаблівы «літаратурны нігілізм», а вынікі працы навукоўцаў-гуманітарыяў пачалі ацэньвацца з пункту гледжання іх непасрэднай матэрыяльнай карыснасці. Бясконцыя пагрозы скарачэнняў, «рэструктурызацый» і «аптымізацый» не спрыялі патрыманню ў Інстытуце здаровай атмасферы навуковага пошуку. Пачаўся адток працаздольных кадраў у ВНУ краіны, у іншыя ўстановы і сферы дзейнасці і нават за мяжу. З 2006 па 2008 г. абавязкі дырэктара Інстытута выконваў В. А. Максімовіч, а ў 2008 г. ордэна Дружбы народаў Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы быў далучаны да Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі і спыніў сваё існаванне як самастойная навуковая ўстанова.

Тым не менш у складзе аб'яднанага Інстытута былі захаваны асноўныя элементы структуры былога Інстытута літаратуры і асноўныя напрамкі яго дзейнасці. Літататуразнаўчыя аддзелы (тэорыі і гісторыі літаратуры і сектар гісторыі беларускай літаратуры ў яго складзе, беларускай літаратуры XX–XXI стст., выданняў і тэксталогіі, узаемасувязей літаратур) скіроўвалі сваю дзейнасць на даследаванне літаратурнага развіцця XIX–XX стст. у яго суаднесенасці з еўрапейскім рамантызмам і рэалізмам, з творчасцю прадстаўнікоў англійскай, італьянскай, іспанскай, польскай, рускай і ўкраінскай рамантычных плыняў, выяўляліся тыпалагічныя сыходжанні і нацыянальная спецыфіка мастацка-літаратурных з'яў, абумоўленая нацыянальным архетыпам і ўласцівасцямі таленту пісьменнікаў. Была раскрыта рознаўзроўневая дынаміка рамантычнага дыскурсу ў творах і літаратурах, вытлумачаны прычыны вяртання рамантызму ў еўрапейскіх літаратурах XX ст., яго працяглая запатрабаванасць у беларускай літаратуры.

У пэўнай ступені аб'яднанне Інстытута мовазнаўства і Інстытута літаратуры адыграла на гэтым этапе існавання філалагічнай навукі станоўчую ролю: узмацніліся творчыя кантакты паміж

супрацоўнікамі, быў праведзены шэраг сумесных навуковых мерапрыемстваў, выконваліся сумесныя навуковыя праекты, вучоныя-літаратуразнаўцы з цікавасцю звярнуліся да выкарыстання дасягненняў сумежнай філалагічнай навукі, засвоіўшы дакладнасць і тэрміналагічную карэктнасць лінгвістыкі. У гэтай сувязі неабходна адзначыць глыбокае даследаванне «Беларускае тэарэтычнае літаратуразнаўства ў дыялогу еўрапейскіх культур: прырода сучасных літаратурных ведаў; навуковыя школы; інавацыйныя стратэгіі» (кіраўнік М. А. Тычына), якое раскрыла змены грамадскага статуса мастацкай літаратуры ў кантэксце іншых мастацтваў і пераасэнсавання змястоўных (функцыянальных, гісторыка-камунікатыўных, пазнавальных, выхаваўчых) сувязей літаратуры з жыццём.

У процівагу негатыўным праявам, звязаным з глабалізацыяй, быў вызначаны станоўчы патэнцыял беларускай і іншых славянскіх літаратур у справе ўмацавання дзяржаўнасці і развіцця самабытнай нацыянальнай культуры як фактараў выхавання чалавека-грамадзяніна і патрыёта, што спрыяе фарміраванню нацыянальнай ідэі і стварэнню станоўчага нацыянальнага іміджу дзяржавы, павышэнню яе прэстыжу ў свеце. Гэта дазволіла вызначыць грамадскі статус літаратуры ў сістэме сучасных сродкаў камунікацыі і выявіць прыярытэтныя напрамкі інавацыйнай стратэгіі культурнага развіцця краіны, што закранула істотныя асновы гуманітарыстыкі ў цэлым і накіравала навукова-даследчую думку на вырашэнне актуальных праблем сучаснага літаратурнага працэсу. Пад кіраўніцтвам С. С. Лаўшука адрадзілася практыка аглядаў літаратуры за бягучы год, супрацоўнікі прынялі ўдзел і арганізавалі ў НАН Беларусі, у навучальных і культурна-асветніцкіх установах краіны шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, 100-годдзя Максіма Танка і інш. Фундаментальны характар мелі працы Я. А. Гарадніцкага «Паэтыка беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: Суб'ектна-аб'ектныя суадносіны» (2010), З. У. Драздовай «Мастацкія варыянты дыялагізму: на матэрыяле класічнай і сучаснай літаратуры» (2010), Р. Ю. Дубашынскага «Прыпавесць у сучаснай беларускай прозе» (2011), В. П. Жураўлёва «Класіка і літаратурная сучаснасць: духоўны патэнцыял чалавека» (2011), С. У. Калядкі «Беларуская сучасная жаночая паэзія: Мастацкія канцэпцыі «жаночага шчасця» (2010), Г. М. Кісліцынай «Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай літаратуры» (2010), Л. Г. Кісялёвай «Маргіналіі: Беларуская гумарыстычная літаратура ХІХ–ХХ стст. у святле сучасных літаратуразнаўчых канцэпцый» (2007), С. С. Лаўшука «Гарызонты беларускай драматургіі» (2010), М. У. Мікуліча «Паэзія Заходняй Беларусі (1921–1939)» (2010), М. І. Мушынскага «Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа» (2012), І. В. Саверчанкі «Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст.» (2012), М. А. Тычыны «Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння» (2012), У. І. Чароты «Дантэ Аліг'еры і беларуская літаратура ХХ стагоддзя» (2009), а таксама калектыўныя даследаванні «Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай літаратуры» (2010), «Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры» (2011), «Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць», а таксама Збор твораў Максіма Танка ў 13 т. Былі распачаты серыі «Помнікі даўняга пісьменства Беларусі» (апублікаваны 2 тамы), «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» ў 50 тамах (апублікаваны 4 тамы), Зборы твораў Івана Шамякіна (у 23 т.) і Івана Навуменкі (у 10 т.).

Вянцом тэксталагічнай працы літаратараў стала ўнікальнае па задуме і спосабах здзяйснення, адзінае ў сваім родзе выданне Збору твораў Якуба Коласа ў 20 т. (2012), не толькі забяспечанае высокадакладным навуковым каментарыем, даведачным матэрыялам і ўступнымі артыкуламі, але і паўнавартаснымі літаратуразнаўчымі працамі, прысвечанымі розным аспектам творчай біяграфіі вялікага беларускага песняра.

Стварэнне дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» і пераўтварэнне аб'яднанага Інстытута мовы і літаратуры ў філіял Цэнтра, уключэнне планавых заданняў па літаратуразнаўству ў дзяржаўную праграму навуковых даследаванняў на 2011–2015 гады «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» («Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава») у якасці адной з яе частак (нават не адлюстраваных у назве самой праграмы) абумовіла зніжэнне

вагі літаратуразнаўства ў агульным кантэксце айчыннай гуманітарыстыкі і адсоўванню яго на перыферыю навукі. Поле фундаментальных навуковых распрацовак было штучна звужана, сацыяльны заказ на іх вынікі зменшаны, перавагу пачалі атрымліваць прыкладныя аспекты літаратуразнаўства. Ва ўмовах, калі ўнутранае аблічча чалавечай асобы змяняецца, калі пераемнасць саміх літаратурных традыцый у многім парушана, калі ў грамадстве выяўляюцца скептычныя настроі адносна нацыянальных і гуманістычных маральных каштоўнасцей, акадэмічнае літаратуразнаўства, каб зарыентавацца ў пераменлівым свеце і выканаць свае задачы па раскрыцці духоўнага патэнцыялу прыгожай славеснасці, павінна змяніць унутраныя фактары свайго існавання, «пераразмеркаваць» патэнцыяльныя магчымасці і рэзервы ў разуменні і асэнсаванні літаратурнага і, шырэй, культурнага развіцця грамадства. Таму стан і задачы сённяшняга беларускага літаратуразнаўства маюць патрэбу ў вельмі ўдумлівых, аналітычных і, зразумела, добразычлівых адносінах.

*M. I. MUSHINSKI, M. A. TYCHINA, S. L. GARANIN*

**OF THE NATIONS FRIENDSHIP ORDER INSTITUTE
OF THE LITERATURE NAMED AFTER YANKA KUPALA (1931–2008)**

## Summary

Institute of the Literature named after Yanka Kupala (1931–2008) is a leading scientific establishment in the field of the literature studies in Belarus. Its development caused systematicity of researches in literature studies in Belarus and publishing of collected works of national classical literature authors. Also it promoted to the strengthening of national culture bases and spirituality of the Belarusian people.